## РАДЫ МЫ ВЯСНУ СУСТРЭЦЬ, ПРОСІМ СОНЦА КРАЙ КАХАНЫ АБУДЗІЦЬ І АБАГРЭЦЬ

*(Зоська Верас)*



— Ой, якая прыгожанькая птушачка! — усклікнула Васілінка.

— Гэта шпак. Цішэй, напалохаеш! — стрымаў яе Лянок.

— Нейкі ён стомлены, — прашаптала Васілінка на вуха Лянку.

Лянок выключыў тэлефон і сказаў:

— Канечне, стомлены. Ведаеш, колькі ён да нас ляцеў?!

— Ой, Лянок, а мы з табой, мабыць, першыя з класа шпакоў убачылі, — узрадавалася Васілінка. — Пойдзем пакажам фотаздымак аднакласнікам.

Раскажыце, якіх птушак вы бачылі ўвесну.

Прачытайце і растлумачце сэнс прыказкі.

- **Жаваранак прылятае на праталіну, шпак — на прагаліну, жораў — з цяплом, а ластаўка — з лістом.**

Правільна вымаўляйце гукі [г], [ў], [ц’].



Разгледзьце малюнак. Каго сустракаюць дзеці?

## Прылёт птушак

Ціхая раніца. Сонейка толькі што ўзышло. У полі яшчэ ляжыць снег. Толькі ўзгоркі чарнеюць. Лужынкі сцягну́ліся за ноч лядком. Але ўжо чуваць вясна, і ўсё пазірае па-вясенняму.



Выйшаў мале́нькі Ясь на двор. Весела так яму, лёгка на сэрцы. Прыгрэе зараз сонца, добра будзе гуляць на дварэ.



Ціха! Што гэта звоніць у небе тоненькім срэбраным званочкам? Так хараша, так міла — душа заміра́е! Ясь прыслухаўся. Не відаць нічога, а ў небе разліваецца тоненькая песенька, як грае хто на срэбранай дудачцы. Гэта жаваранак! І так весела Ясю, здаецца, каб можна было, пацалаваў бы мілую птушачку. Галубка! Яна ўжо вярнулася з далёкай старонкі ў наш бедны край і ў ясным небе заліваецца дзіўнаю песняю.

— Тата! Тата! Чуеш жа́воранка?

Бацька Яся прыслухаўся.

— Але, жаваранак. Ну, зараз, брат, і шпак прыляціць, а там і бусел, а за ім і ўсе птушкі.

Рад Ясь, што першы пачуў ён жаваранка, і пабег хваліцца сваім сябра́м. Дзеці выходзілі на двор слухаць першую песню вясны. Ім было весела.

— Эх, дзеці! Не скора яшчэ вясна, — казаў хто-небудзь старэйшы.

Дзеці не любілі слухаць такія рэчы. Яны любяць вясну, яны любяць, каб гаварылі ім аб вясне. А часам і праўда захаладáе; дзеці кажуць: «Зусім не холадна; не толькі не холадна — горача нават».

Кожную новую госцю-птушку дзеці сустракаюць з радасцю.

Праз некалькі часу прылятае шпак. Холадна, туман, а ён мала дбае. Спявае на ўсё поле вясёлыя песні, седзячы дзе-небудзь на голай бярозе, як бы і холаду яму няма.

*Паводле Якуба Коласа.*

1. Чаму Ясю было весела і лёгка на сэрцы? Прачытайце, як аўтар піша пра стан хлопчыка.
2. З чым аўтар параўнаў песню жаваранка? Чаму хочацца пацалаваць мілую птушачку?
3. Што казалі дзецям старэйшыя? Падумайце, чаму дзеці не пагаджаліся з імі.
4. Якімі пачуццямі напоўнены твор? Знайдзіце словы, з дапамогай якіх аўтар выражае гэтыя пачуцці.

5. Як вы разумееце выраз *мала дбае*?
6. Падзяліце твор на сэнсавыя часткі ў адпаведнасці з планам.

П л а н

1. У небе ціха разліваецца тоненькая песенька.
2. Дзеці выходзілі на двор слухаць першую песню вясны.
3. Не скора яшчэ вясна.
4. Кожную новую госцю-птушку дзеці сустракаюць з радасцю.

7. Перакажыце твор па частках у групах.

Чаму кажуць, што вясной абуджаецца прырода? Хто вас будзіць раніцай? Як вы вітаецеся раніцай у сям'і? Якую раніцу вы любіце: сонечную ці пахмурную, з дожджыкам ці ветрам?



Пры вітанні беларусы карыстаюцца рознымі выразамі, напрыклад: *Добры дзень вам! Дзень добры! Дзень добры ў хату! Добрага дня!*

Падумайце і скажыце, якімі словамі можна вітаць вясну.

Прачытайце верш. Навошта аўтар будзіць дзетак?

## Вясенняя раніца



*Міхась Чарот*

Гляньце, дзеткі, у аконца,
Ды пара ўжо ўставаць.
Як прыгожа там бясконца.
Сорам, дзеткі, позна спаць!
Заглянула сонца ў вочкі,
Дзень прыйшоў — даволі сну.
На свет гляньце, галубочкі,
Усе віта́юць там вясну.
Зелянé е траўка ў полі.
У небе птушачкі пяюць.
Эх, зімы не будзе болей,
Хутка кветкі зацвітуць.

1. Якія вясновыя прыкметы паказвае аўтар у вершы? Знайдзіце і прачытайце адпаведныя радкі.
2. Чым узрадаваны аўтар? Прачытайце.
3. Знайдзіце ў вершы словы з ласкавым адценнем. Чаму іх так многа ў вершы?
4. Падрыхтуйцеся і прачытайце верш выразна.